СЛОВА УДЗЕЛЬНІКАМ

Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК, старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў:

— Яшчэ падчас III Форуму Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што парламентарыям Беларусі і Расіі трэба ўзяць пад патранаж супрацоўніцтва органаў мясцовага самакіравання. У нас ужо ёсць вопыт такога супрацоўніцтва з Бранскай вобласцю. Мы напрацавалі пэўную практыку і паступова яе развіваем. Па ўсіх кірунках атрыманы добры вынік. Гэтым разам мы падпісваем пагадненні аб супрацоўніцтве з заканадаўчымі сходамі Калужскай, Самарскай, Смаленскай, Калінінградскай, Ленінградскай абласцей і Краснадарскага краю. Нам вельмі цікавы вопыт заканадаўчых сходаў Расійскай Федэрацыі ў рабоце з выбаршчыкамі, у фарміраванні і рабоце па стварэнні органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, норматорчая дзейнасць па згаданым кірунку. Будзем напаўняць пагадненні канкрэтнымі мерапрыемствамі па супрацоўніцтве.

Юрый НАРКЕВІЧ, старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў:

— З дзясяткамі расійскіх рэгіёнаў у Брэстчыны склаліся трывалыя партнёрскія, ды і сяброўскія адносіны. Расія для нашай вобласці з'яўляецца асноўным гандлёва-эканамічным партнёрам, на яе прыходзіцца крыху больш за 70 працэнтаў экспарту рэгіёна. Апошнім і абумоўлена грунтоўнае стаўленне да Форуму рэгіёнаў. Да мерапрыемства падрыхтаваны цэлыя пакеты дакументаў (і не толькі ў выглядзе кантрактаў асобных прадпрыемстваў), узгоднены дамовы рэгіянальнага характару. Напрыклад, чакаецца падпісанне дагавораў аб супрацоўніцтве паміж Брэсцкай вобласцю і Бурацыяй, а таксама Калужскім рэгіёнам.

Ну і нашым дзелавым колам ёсць што паказаць усходнім суседзям. Прадпрыемствы вязуць выстаўкі сваёй прадукцыі і канкрэтныя прапановы.

Ігар ЖУК, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:

— Кожны форум прыносіць і эканамічныя вынікі, і тут, акрамя падпісання дагавораў аб супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі і заканадаўчымі сходамі, абласнымі Саветамі дэпутатаў будуць падпісаны і камерцыйныя кантракты на даволі значную суму. Гэта сведчыць аб тым, што рэгіянальнае супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі развіваецца, і рэгіёны з'яўляюцца лакаматывам для збліжэння Расіі і Беларусі ў межах саюзнай дзяржавы.

Аб важнасці кірунку сведчыць і нядаўні прыезд у наш Гродзенскі рэгіён Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Расійскай Федэрацыі Міхаіла Бабіча. Дыпламат наведаў Беларускую атамную станцыю, партнёрам па будаўніцтве якой выступае расійская кампанія. Зараз намаганні абедзвюх краін накіраваны на тое, каб здаць аб'ект своечасова, у вызначаны тэрмін. Дарэчы, пасол адзначыў, што работы вядуцца згодна з графікам.

Важна, што дыпламат звярнуў увагу на гродзенскую «малочку», пастаўку якой часам абмяжоўвае расійскі бок. Міхаіл Бабіч змог пазнаёміцца з поўным цыклам вырабу прадукцыі — ад малочнатаварнага комплексу да перапрацоўчых прадпрыемстваў. У прыватнасці, пасол пабываў на камбінатах Смаргоні, Ашмян і Ліды. На гэтых заводах вырабляюць сыры і тварог, якія пастаўляюцца ў Расію. Кожнае прадпрыемства актыўна супрацоўнічае з расійскімі рэгіёнамі, экспарт прадукцыі ў гэту краіну складае да 80 %. Дыпламат змог асабіста пазнаёміцца з тым, як вядзецца работа на малочных заводах — ад прыёмкі да лабараторыі. І вельмі важна, што пасол мае намер выпрацаваць сумесныя прапановы па пераадольванні цяжкасцяў у гэтым кірунку, стварыць умовы, каб эканоміка малочных прадпрыемстваў паспяхова развівалася на карысць абедзвюх дзяржаў — Расіі і Беларусі.

ЕЩЕ НА ШАГ

Председатель Могилевского горисполкома Владимир ЦУМАРЕВ

Впервые за время существования Форума регионов Беларуси и России это мероприятие проходит в Беларуси именно на региональном уровне — в Могилеве. Насколько это почетно и к чему обязывает, какие надежды тут связывают с этим значимым политическим событием, мы выяснили в разговоре с председателем Могилевского горисполкома Владимиром ЦУМАРЕВЫМ.

— Владимир Михайлович, город за время подготовки к форуму заметно похорошел и преобразился. И многое делалось при непосредственном участии горожан. Проводились общественные обсуждения, субботники, акции... Насколько активно могилевчане отзывались на призывы сделать свой город к Форуму регионов уютнее и красивее?

— Я хочу поблагодарить за помощь и поддержку всех: трудовые коллективы, общественные организации, жителей города — никто не остался в стороне. Только в сентябре мы провели три субботника. Нашлись в городе неравнодушные жители, которые в своих дворах отремонтировали и покрасили игровое оборудование, разбили клумбы, установили малые архитектурные формы. В ходе акции «#ЗаДело» молодежь наводила порядок на территории объектов, которые стали площадками проведения секций и встреч в рамках форума. Мне импонирует, как работают активисты Центра городских инициатив Могилева. Это благодаря им наши могилевские дворики превращаются в стильные арт-объекты.

— Город не успевает примерять на себя высокие титулы — культурная столица, молодежная столица, теперь вот столица Форума регионов. Как удается держать такую высокую планку?

— В Могилеве и раньше не раз принимались судьбоносные для народов Беларуси и России решения. Достаточно вспомнить годы Первой мировой войны, когда здесь находилась ставка российского императора. А перед началом Великой Отечественной войны в наш областной центр даже планировали перенести столицу БССР.

Могилев остается местом проведения серьезных мероприятий республиканского и международного уровня по сегодняшний день. Именно в нашем городе состоялось заседание Совета Министров Союзного государства с участием глав правительств Беларуси и России Андрея Кобякова и Дмитрия Медведева, заседание Межбанковского валютного совета Центрального банка Российской Федерации и Национального банка Республики Беларусь, заседание совместной коллегии белорусского МЧС, МВД Казахстана и МЧС России. В 2018 году Могилев стал молодежной столицей Беларуси, ему присвоено звание «Город, дружественный детям». И вот сейчас мы принимаем участников V Форума регионов Беларуси и России.

— Сегодня экономика Беларуси ориентируется на IT-технологии, разработана госпрограмма инновационного развития страны. Насколько плотно над этим работают могилевские вузы и насколько инновационно активны в Могилеве предприятия?

— Хорошим примером производства, ориентированного на IT-экономику, является предприятие «СТРИМ», которое разрабатывает и поставляет уникальное оборудование на крупнейшие предприятия страны — БелАЗ и Минский завод колесных тягачей.

Уникальную технологию литья методом намораживания предлагает наше научно-производственное предприятие «Технолит». Этот метод позволяет организовать замкнутое безотходное производство и обеспечить выпуск продукции на уровне лучших мировых стандартов.

На ведущих предприятиях пищевой и химической отраслей города открыты филиалы кафедр Могилевского госуниверситета продовольствия, где ведется практико-ориентированная подготовка специалистов. Чаще всего студенты в своих курсовых и дипломных работах обращаются к проблемным вопросам, чтобы найти пути их решения на производстве. Еще одно высшее учебное заведение Могилева — Белорусско-Российский университет (БРУ) — вошло в список семи ведущих вузов страны,

АДЛЕГЛАСЦЬ НЕ ПЕРАШКОДА

Губернатар Іркуцкай вобласці — пра агульныя інтарэсы і сумесныя праекты

Ад Мінска да Іркуцка шлях няблізкі — восем гадзін лёту (з перасадкай у Маскве, прамога рэйса пакуль няма), пяць тысяч кіламетраў. Але ў наш час нават такая значная адлегласць не перашкода для плённага супрацоўніцтва, калі ёсць на гэта жаданне і памкненне.

Аб тым, што гэты сібірскі рэгіён мае эканамічныя адносіны з нашай краінай, можна здагадацца ўжо ў іркуцкім аэрапорце — пасажыраў ад самалёта да будынка аэравакзала дастаўляе наш родны МАЗ. У самім горадзе давялося бачыць краму з надпісам «Беларускія прадукты»...

Новы імпульс супрацоўніцтву даў візіт дэлегацыі Іркуцкай вобласці амаль два гады таму ў Беларусь. Губернатара расійскага рэгіёна тады прымалі на найвышэйшым узроўні, прадстаўнікі дзелавых колаў наведалі буйныя прадпрыемствы, падпісалі шэраг дамоў аб супрацоўніцтве. Наступным крокам у гандлёва-эканамічным збліжэнні быў IV Форум рэгіёнаў, падчас якога падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж урадам Іркуцкай вобласці і Брэсцкім аблвыканкамам.

Аб тым, як гэта супрацоўніцтва рэалізуецца на практыцы, удалося запытаць у непасрэднага гульца на гэтым полі, дакладней, калі працягваць спартыўную аналогію, — у капітана адной з камандаў — губернатара Іркуцкай вобласці Сяргея ЛЕЎЧАНКІ.

У кіраўнікоў Брэсцкай і Іркуцкай абласцей склаліся добрыя сяброўскія адносіны.